# РАБОЧАЕ ПЫТАННЕ Ў ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСІ

Дубовік А.А., Дубовік А.К. г. Мінск, БНТУ

У XIX ст. у Расійскай імперыі паўстала рабочае пытанне. Дадзенае паняцце з’яўляецца шматпланавым, аб’ядноўвае ў сабе шэраг кампанентаў: фарміраванне рабочага класа; яго колькасць, структуру, склад; умовы працы і ўзровень жыцця наёмных рабочых; прававое і палітычнае становішча рабочых; урадавая палітыка і інш. [1].

Да рэвалюцыі 1905–1907 гг. царызм і буржуазія адмаўлялі існаванне рабочага пытання, сцвярджаючы, што ў Расіі няма рабочага класа ў заходнееўрапейскім сэнсе гэтага слова, а ёсць усяго толькі «саслоўе фабрычных людзей», учарашніх сялян. У пачатку XX ст. мела месца наступнае меркаванне: рабочыя ў Расіі калі не шыкуюць, дык усё ж іх становішча лепшае, чым у сялян, бо яны маюць дзве крыніцы даходу: заробак на прамысловым прадпрыемстве і гаспадарку ў вёсцы. Як выказаўся аднойчы вядомы расійскі пісьменнік Л.М. Талстой, фабрычныя рабочыя – «сапраўдныя кавалеры ў параўнанні з мужыкамі» [2, с. 183]. Дактрына аб спецыфічным патрыярхальным развіцці Расіі, ігнараванне рабочага пытання, размытасць шэрагу норм фабрычнага заканадаўства – гэтыя і іншыя фактары тармазілі фарміраванне сацыяльна-партнёрскіх адносін. Тэрмін «рабочае пытанне» у гэты час выкарыстоўваўся толькі ў працах вучоных левай або ліберальнай плыняў [3].

Неабходна, аднак, прызнаць, што становішча рабочага класа Расіі і Беларусі на рубяжы XIX – XX стст. было больш цяжкім, чым у краінах Заходняй Еўропы. Перажыткі феадальна-прыгонніцкіх адносін адбіваліся як на ўзроўні заработнай платы, так і на ступені эксплуатацыі працоўных. За сваю цяжкую працу рабочыя атрымлівалі такі заробак, які далёка не заўсёды забяспечваў пражытачны мінімум, асабліва, калі ў іх былі вялікія сем’і. Памер заробку быў звязаны, перш за ўсё, са станам рынку працы і працягласцю працоўнага дня. На ўзровень зарплаты рабочых Беларусі ўплывалі і такія фактары, як аграрная перанаселенасць вёскі і канцэнтрацыя ў гарадах і мястэчках вялікай колькасці беспрацоўнага насельніцтва, згоднага пайсці на любую працу. Па падліках вядомага гісторыка М.В. Доўнар-Запольскага, сярэдняя

гадавая заработная плата рабочых паўночна-заходніх губерняў у 1897 г. складала толькі 147,8 руб. [4, с. 183]. Характэрнай рысай прамысловасці Беларусі канца XIX ст. з'яўлялася значная ўдзельная вага дробнай вытворчасці. Па колькасці занятых у ёй рабочых яна амаль у 3,5 разы перавышала фабрычна-заводскую прамысловасць. Сярод рамесных рабочых большасць складалі яўрэі. Іх колькасная перавага ў прамыслова-гандлёвым насельніцтве гарадоў склалася ў выніку царскага закону «Аб мяжы яўрэйскай аселасці», у якую поўнасцю ўваходзілі і беларускія губерні [5].

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. пакончыла з ілюзіяй, што ў Расіі няма рабочага пытання. Яно пачало прызнавацца адной з асноўных сацыяльных праблем разам з аграрным і нацыянальным пытаннямі. Ужо ў студзені 1905 г. была створана камісія па рабочаму пытанню, якая атрымала ў паўсядзённым ужытку назву «камісія Какоўцава», па прозвішчу яе старшыні, тагачаснага міністра фінансаў. Праграма, выпрацаваная камісіяй, зыходзіла з пасылу, што ў Расіі рабочае пытанне носіць такі ж характар, як і на Захадзе, і, значыць, вырашаць яго трэба так, як, напрыклад, вырашыў яго О. фон Бісмарк у Германіі. У адпаведнасці з гэтым была распрацавана праграма, якая складалася з чатырох асноўных пунктаў: 1) абавязковая арганізацыя бальнічных кас на аснове сумесных узносаў наймальнікаў і рабочых; 2) стварэнне на фабрыках і заводах змешаных органаў з прадстаўнікоў адміністрацыі і рабочых «для абмеркавання і вырашэння ўзнікаючых на глебе дагавору найма пытанняў, а таксама для паляпшэння побыту рабочых»; 3) скарачэнне працоўнага дня з 11,5 гадзін да 10, абмежаванне законам працягласці звышурочных работ; 4) перагляд артыкулаў закона, караючых за забастоўкі і датэрміновыя скасаванні дагавора аб найме. Сэнс апошняга пункта заключаўся ў адказе ад погляду на стачку як парушэнне грамадскага парадку, што падлягае крымінальнаму праследаванню і пакаранню [6].

Рабочае пытанне знайшло адлюстраванне ў грамадска-палітычнай барацьбе ў ходзе выбараў і дзейнасці Расійскай дзяржаўнай думы ў 1906 – 1917 гг., хоць цэнтральным пытаннем у яе першых скліканнях было аграрнае. Па выбарчаму закону ад 11 снежня 1905 г. некалькі пашырылася кола выбаршчыкаў у параўнанні з «Палажэннем» ад 6 жніўня 1905 г., да іх далучаліся рабочыя. Аднак выбарчыя правы мелі толькі рабочыя

прадпрыемстваў, дзе колькасць працуючых мужчын ва ўзросце звыш 25 гадоў перавышала 50 чалавек. У выніку ад удзелу ў выбарах фактычна былі адхілены тры чвэрці ўсіх рабочых, а ў Беларусі працэнт рабочых, дапушчаных да ўдзелу ў выбарах, быў яшчэ ніжэйшы – толькі 10–15%. У 21 з 71 губерняў Расійскай імперыі, у тым ліку, ў Віцебскай, рабочыя не мелі свайго прадстаўніцтва. Поўная перавага на выбарах была забяспечана памешчыкам і буйной буржуазіі. Адзін голас памешчыка і 3,5 голаса гарадской буржуазіі адпавядалі 45 галасам рабочых. Таму рабочыя многіх прадпрыемстваў у Мінску, Мазыры, Пінску, Гродна байкатавалі выбары ў Дзяржаўную думу [6, с. 16,17,18,28].

Абнаўленне дзяржаўнага ладу Расійскай імперыі ў 1905–1906 гг. істотна не паўплывала на законатворчасць па рабочаму пытанню, буйнейшыя думскія фракцыі не лічылі яго прыярытэтным. Ні адна з многіх прапаноў сацыял-дэмакратаў па рабочаму пытанню не праходзіла; кадэты і акцябрысты абаранялі пазіцыю прадпрымальніцкіх саюзаў. Усяго два месяцы праіснавала І Дума і толькі паспела выказацца ў адрас імператара на карысць свабоды арганізацыі і самадзейнасці рабочых. ІІ Дума стварыла камісію па дапамозе беспрацоўным, якая нічым сябе так і не праявіла. ІІІ і ІV Думы ўхвалялі з невялікімі папраўкамі прапановы ўрада, сярод якіх самымі значнымі былі абяцаныя яшчэ ў 1904 г. царскім указам і прынятыя, нарэшце, ІІІ Думай у студзені 1912 г. два законы аб страхаванні рабочых: ад няшчасных выпадкаў і па хваробе. Пасля прыняцця ў маі 1912 г. Дзяржаўным саветам і зацвярджэння 23 чэрвеня гэтага года імператарам яны сталі законамі і склалі, па сутнасці, базу сацыяльнага рабочага заканадаўства [8, с. 121].

Закон аб страхаванні ад няшчасных выпадкаў часткова пераглядаў Правілы ад 2 чэрвеня 1903 г. Ён па-ранейшаму распаўсюджваўся на рабочых толькі фабрычна-заводскай і горнай прамысловасці. У ліку неабароненых законам заставаліся будаўнічыя рабочыя, сярод якіх быў асабліва высокім узровень вытворчага траўматызму, многія групы прамысловых рабочых, усе сельскагаспадарчыя рабочыя і работнікі гандлю. Дапамога на час лячэння і пенсіі ў выпадку страты працаздольнасці складалі 2/3 заробку. У параўнанні са старым законам новым было тое, што асабістая адказнасць прадпрымальніка замянялася калектыўнай: рашэнне аказваць ці не аказваць дапамогу і ў якім памеры прымала

страхавое таварыства – акружное аб’яднанне прадпрымальнікаў. Страхаванне на выпадак хваробы станавілася абавязковым. Бальнічныя касы выдавалі хворым дапамогу, сродкі для якой складаліся з узносаў усіх рабочых і ўладальнікаў прадпрыемстваў. У працэсе абмеркавання законапраекта прадстаўнікі гандлёва-прамысловых колаў выказвалі пажаданне, каб расходы на лячэнне неслі толькі рабочыя ці каб доля гаспадароў была зменшана. Згодна з прынятым законам, уладальнік уносіў у касу 2/3 ад сумы ўзносаў рабочых, у яго ж захоўваліся ўсе грошы касы – для пазбягання выкарыстання іх не па прызначэнню, напрыклад, для падтрымкі бастуючых, і ён старшынстваваў на сходах упаўнаважаных – выбарных ад рабочых (агульныя сходы ўсіх членаў касы не дазваляліся). Нагляд за дзейнасцю бальнічных кас і страхавых таварыстваў ажыццяўлялі губернскія прысутнасці пад старшынствам губернатараў. Вышэйшым кантрольным органам быў Савет па справах страхавання, які дзейнічаў пад старшынствам міністра гандлю і прамысловасці.

Самі па сабе гэтыя законы былі крокам наперад у вырашэнні пытання аб страхаванні рабочых. Аднак не менш істотным было і тое, як яны прымяняліся на практыцы, у прыватнасці, у Беларусі. Тут у 1912 г. пад наглядам фабрычнай інспекцыі знаходзілася 1280 прадпрыемстваў. На канец гэтага года на іх працавала 51,3 тыс. рабочых дарослага ўзросту пры агульнай колькасці працаваўшых па найму звыш 400 тыс. чалавек [8, с. 121]. На 1 жніўня 1914 г. у пяці беларускіх губернях налічвалася 128 бальнічных кас, а колькасць іх удзельнікаў склала 47 тыс. чалавек [9, с.167]. Існавала таксама абмежаванасць па тыпах страхавання (не было страхавання па старасці, беспрацоўю), што не дазволіла карэнным чынам палепшыць сацыяльнае становішча рабочых Расійскай імперыі.

Акрамя таго, у 1907 г. у Дзяржаўную думу быў унесены праект закона аб страхаванні ад прафесійных захворванняў. Асаблівых пярэчанняў супраць яго не было, але дэпутаты не спяшаліся, а з пачаткам Першай сусветнай вайны аб гэтым законапраекце запамяталі. У гады вайны рэпрэсіі поўнасцю знішчылі рэшткі легальнасці ў рабочым руху. Урад, падтрыманы саюзам заводчыкаў і фабрыкантаў, палічыў несвоечасовым стварэнне прыміральных камер і ажыццяўленне іншых пунктаў даваеннай ліберальнай рабочай праграмы. У 1916 г. прамыслоўцы

А.І. Канавалаў, браты Рабушынскія выступілі з ідэяй стварэння ўсерасійскага рабочага саюза, які павінен быў садзейнічаць сацыяльнаму міру і паспяховай рабоце на патрэбы вайны, але арганізацыйны з'езд прадстаўнікоў рабочых не быў дазволены ўладамі. Калі ацэньваць паспяховасць вырашэння рабочага пытання ў Расійскай імперыі, адзначае расійскі даследчык І.С.Разенталь, дык трэба прызнаць, што перыяд, які папярэднічаў 1917 г., гэта час упушчаных магчымасцяў: з запланаваных дзесяці былі прыняты ўсяго два законы. Віной таму – не толькі менталітэт дзяржаўнай бюракратыі з яе традыцыйнай падазронасцю да незалежнай ініцыятывы і да грамадскіх аб'яднанняў, але і эгаізм і своекарыслівасць прадпрымальнікаў. Апошнія ў большасці сваёй імкнуліся да ўлады і не падтрымлівалі больш прадбачлівых прадстаўнікоў свайго класа, якія прапаноўвалі з мэтай змяншэння сацыяльнага напружання даць рабочым арганізацыям рэальную свабоду і ўзаемадзейнічаць з імі [2, с. 194].

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Часовы ўрад не рашыўся абвясціць 8-гадзінны працоўны дзень. Аднак рэвалюцыйныя лозунгі ўвасабляліся ў жыццё без ўрадавых распараджэнняў. Пачала ажыццяўляцца ідэя рабочага кантролю над вытворчасцю.

У савецкай гістарыяграфіі лічылася, што рабочае пытанне, пад якім падразумявалася, перш за ўсё, эксплуатацыя рабочага класа, было вырашана ў СССР пасля сацыялістычнай рэвалюцыі і ўстанаўлення дыктатуры пралетарыяту. У сучаснай гістарычнай літаратуры рабочае пытанне трактуецца шырэй, чым праблема працы і капіталу, разглядаецца як пытанне аб узаемаадносінах паміж рабочым класам і грамадствам. Выказваецца думка, што рабочае пытанне не знікла, яно і ў наш час з'яўляецца актуальным, але механізмы яго праяўлення ў нашыя дні перацярпелі сур'ёзныя змены і што менавіта з гэтага пункту гледжання трэба падыходзіць да сітуацыі з рабочым пытаннем у краінах СНД [10].

Выкарыстаная літаратура

1. Напалкова, И.Г. Рабочий вопрос в России в XIX – начале XX века: традиции социального патернализма: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / И.Г. Напалкова. – Саранск, 2005. – 21 с.

2. Розенталь, И.С. Рабочий вопрос в дореволюционной России / И.С. Розенталь // Отечественные записки. – 2007. – № 4. – С.181-195.

3. Озеров, И. Политика по рабочему вопросу России за последние годы (по неизданным документам) / И. Озеров. – М., 1906. – 322 с.

4. Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг./ М.В. Довнар-Запольский. – Минск: Госплан БССР, 1926. – 238 с.

5. Дубовик, А.К. Формирование рынка труда в Беларуси в XIX – начале XX в. / А.К Дубовик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2003. – № 1. – С. 64–69.

6. Рабочий вопрос в комиссии В.Н. Коковцева 1905 г. – М. – 1926. – 57 с.

7. Забаўскі, М.М. Грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі ў ходзе выбараў і дзейнасці Расійскай Дзяржаўнай Думы I–IV скліканняў (1906–1917 гг.): аўтарэф. дыс. ... д-ра гіст. навук: 07.00.02 / М.М. Забаўскі; БДПУ. – Мінск, 2000. – 40 с.

8. Фамін, В.М. Сацыяльныя мерапрыемствы дзяржаўных органаў па вырашэнні рабочых пытанняў у Беларусі (канец XIX – пачатак XX стст.) / В.М. Фамін // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф.: у 2 ч. – Мінск, 2009. – Ч. 1. – С. 117–123.

9. История рабочего класса Белорусской ССР. В 4-х т. – Минск, 1984. – Т. 1. – 400 с.

10. Чураков, Дм. О “рабочем вопросе” в прошлом и настоящем. Материалы круглого стола / Дм. Чураков // Альтернативы. – 2006. – № 1. – С. 140–144.